МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
220004, г.Мінск, пр.Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА - КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

10.12.2014 г. № 11-01-01/222

Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт

Гродзенскі гарадскі
выканаўчы камітэт

**1. Аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека**

1.2. Па выніках разгляду традыцыі вырабу велікодных вербаў (пальмаў), якія маюць арэал распаўсюджвання ў г. Гродна, аграгарадках Адэльск, Індура, г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці, з улікам адпаведнасці крытэрыям, вызначаным абзацам другім падпункта 1.1 і абзацам другім падпункта 1.4 пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь”, ВЫРАШЫЛІ:

1.2.1. адзначыць, што разглядаемы элемент нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека “Выраб велікодных вербаў (пальмаў) на тэрыторыі паўночна-заходняй Гродзеншчыны” звязаны з ведамі, навыкамі і традыцыйнымі рамёствамі, узнаўляецца ў залежнасці ад навакольнага прыроднага і культурнага асяроддзя, адлюстроўвае пачуццё самабытнасці, садзейнічае захаванню існуючай культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека, мае наступныя характэрныя рысы:

тэрыторыя бытавання – г. Гродна, аграгарадкі Адэльск, Індура, г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна Гродзенская вобласці;

прымеркаванасць да Вялікадня і дня Святога Казіміра;

выраб велікодных вербаў (пальмаў) уключае збор і падрыхтоўку расліннага матэрыялу, які складаецца ў кампазіцыі на вербавых галінках;

выкарыстанне трох галінак вербы ў якасці асновы, на якой ствараецца кампазіцыя;

кампазіцыя з розных раслін (кветкі, зёлкі, каласкі, шышкі і інш.) размяшчаецца на адным баку галінак, утвараючы плоскую форму “лапатку”;

сярэдні памер вербаў (пальм) складае каля 50 сантыметраў;

1.2.2. лічыць неабходным наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека “Выраб велікодных вербаў (пальмаў) на тэрыторыі паўночна-заходняй Гродзеншчыны” у г. Гродна, аграгарадках Адэльск, Індура,

ГРОДНЕНСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ
«12» 01 2015 г.
31.12.2014
2867/019-11

г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна Гродзенская вобласці, з наданнем катэгорыі “А”;

1.2.3. ДУА “Інстытут культуры Беларусі” у пашпарце разглядаемага элемента нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека адлюстраваць найбольш характэрныя ўласцівыя рысы, выключыўшы з іх пераліку выкарыстанне штучных анілінавых фарбаў;

1.2.4. прапанаваць Гродзенскаму аблвыканкаму, Гродзенскаму гарвыканкаму звярнуць увагу на неабходнасць прыняцця мер па забеспячэнні жыццяздольнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаючы яго ідэнтыфікацыю, дакументаванне, даследаванне, захаванне, абарону, папулярызацыю, перадачу навыкаў наступнаму пакаленню з дапамогай фармальнай і нефармальнай адукацыі. Разам з тым, неабходна выключыць аспекты камерцыялізацыі вынікаў вытворчасці разглядаемых вырабаў.

Намеснік Міністра,
старшыня навукова-
метадычнай рады А.А.Яцко